УДК 340.132(091)

## ПРЫЧЫНЫ СТАНАЎЛЕННЯ ДАЧНАГА РУХУ Ў БССР

Лубінскі Іван Іванавіч
старшы выкладчык кафедры філасофіі і паліталогіі
Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта
(г. Мінск, Беларусь)

*Даследаванне прычын станаўлення дачнага руху ў БССР дазваляе глыбей разабрацца ў значэнні дачы для грамадства і для асобнай сям'і, убачыць яе перспектыўнае выкарыстанне.*

Сучасны чалавек многія дасягненні двух апошніх стагоддзяў лічыць настолькі ўстойлівымі, што рэдка задумваецца пра прычыны ўзнікнення і неабходнасць усяго, што яго акружае і напаўняе жыццё. Адна з такіх з'яў, пра якую большасць мяркуе, што так і трэба, – гэта дача. Для беларусаў дача стала часткай жыцця, асабліва для гарадскога насельніцтва.

Аднак дача для беларусаў стала адносна нядаўнім набыткам савецкага ладу. Усе іншыя формы дадатковага землекарыстання, што былі на нашых землях раней, не мелі такога характару даравання ці выконвалі функцыю асноўнага сродка для жыцця. Можна ўзгадаць зямельныя надзелы мяшчан, выдзяленне панам кавалка для беззямельных, валоданне мноствам маёнткаў для магнатаў. Але ніводная такая з'ява не ўмяшчала ў сабе столькі функцый, якія характэрныя для дачы. Гэта дараванне, месца працы, адпачынку, прэстыжнасць атрымання, жаданне вырвацца з руціны гарадскога жыцця, магчымасць валодаць чымсьці у час сацыялістычнага хапуна і безгаспадарнасці і іншыя прывабнасці і асаблівасці дачы. А калі дадаць тыя абмежаванні, якімі савецкая ўлада спрабавала прыцішыць дачныязапыты насельніцтва, узнікае заканамернае пытанне – якія ж прычыны ўзнікнення і распаўсюджвання дач у Беларусі?

Дачная тэматыка слаба распрацавана гісторыкамі. Больш прац можна знайсці сярод юрыстаў і географаў, у асноўным расійскіх ці яшчэ савецкіх, якія абагульнялі дачны вопыт усёй савецкай прасторы ці прывязвалі свае даследаванні да пэўнага рэгіёну ці нават горада [5]. У Беларусі гэта пытанне мала даследавалася. Толькі ўпамінанні пра дачы у карыстанні савецкіх грамадзян апіраюцца на збольшага стэрэатыпнае меркаванне. Таму комплекснае даследаванне гэтага феномену, які і на сёння складае важную частку жыцця беларусаў, актуальнае.

Негледзячы на тое, што ў сучаснай гутарковай беларускай мове, часам у публіцыстыцы, можам сустрэць неалагізм "лецішча", аднак у навуковым абароце прыняты тэрмін дача", які не перакладаецца на іншыя мовы і такім чынам фіксуе гэты феномен для нашых мясцін. Тэрмін "дача" сустракаўся ў практыцы расійскіх улад яшчэ з XVIII ст. і азначаў ў той час падараванае дзяржавай зямельнае ўладанне, звычайна з прыгоннымі. Часам гэта маёмасць успрымалася ў сучасным сэнсе як месца адпачынку з вясны да восені, аднак толькі для заможных жыхароў, пераважна памешчыкаў [7, с. 5]. У практыцы Рэчы Паспалітай такое слова не сустракалася, аднак вядомы вобраз жыцця заможнай шляхты пераязджаць з аднаго маёнтка ў другі крыху падобны да дачнага жыцця.

У перыяд уваходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі многія паняцці расійскай рэчаіснасці былі прынятыя і у нас. Аднак пераважна сялянская Беларусь не вельмі падыходзіла для распаўсюджвання дач. І тут можна заўважыць цесную сувязь дачы з гарадскім жыццём. Як мяркуюць даследчыкі, развіццё гарадоў, а таксама некаторае пагаршэнне экалогіі ў іх садзейнічалі станаўленню цэлых дачных пасёлкаў і распаўсюджванню дачнай ідэі сярод шырокіх слаёў гарадскога насельніцтва, асабліва інтэлігенцыі [1, с. 14]. Спрыяла пашырэнню дач і развіццё транспартных зносін, асабліва з'яўленне чыгункі. Дачныя пасёлкі сталі цэлым культурным і сацыяльным феноменам у жыцці буйных гарадоў Расіі. І, хоць у Беларусі пакуль такога дачнага буму не было, варта адзначыць менавіта такія спрыяльныя ўмовы для распаўсюджвання падобнага ў далейшым. Зразумелым становіцца натуральны працэс станаўлення дачнага руху – задаволіць патрэбу адпачынку гараджан у прыродным масіве, часта звязаным з лесамці воднымі аб'ектамі, а таксама пашыралася выкарыстанне дач для вырошчвання сваёй садавіны і агародніны. Гэта паляпшала матэрыяльны стан гараджан, стала прыкметай стабільнасці.

Міжваеннны перыяд не прынёс Беларусі пашырэння дачнага жыцця, аднак асабістыя дачы як падарунак улад для найбольш заслужаных таварышаў прыкметна ўзнялі прэстыж валодання дачай. У 1930-я гг. пашырылася форма надзялення зямлёй завадскіх і фабрычных рабочых, што было звязана з голадам у СССР, аднак гэты працэс не закрануў БССР [6, с. 4]. Можна заўважыць чарговыя прычыны пашырэння дач – гэта прэстыж і сродак выжывання. У дадзеным выпадку дача становілася выразна несавецкім элементам, хаця бальшавіцкія ўлады і стараліся гэтай з'яве надаць хоць крыху сацыялістычны характар, прапануючы калектыўны характар землекарыстання і сацыялістычнае спаборніцтва ў вырошчванні і збіранні ураджаю з дачных участкаў.

Вялікая Айчынная вайна прымусіла бальшавіцкую ўладу не шукаць нейкіх фармальных сацыялістычных метадаў, а звяртацца больш да здаровага сэнсу. У гэты час пашырылася калектыўнае агародніцтва на неакупаваных ці вызваленых тэрыторыях як адзіна магчымы сродак выжывання. А першыя пасляваенныя гады прынеслі ўжо сапраўднаедачнае жыццё на беларускія землі. Тут спрацавалі практычна ўсе фактары, што тычыліся дач у Расіі – адпачынак для заслужаных людзей,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сродак выжывання для бедных гараджан, прэстыжнасць валодання для наменклатуры і гарадской інтэлігенцыі, магчымасць забяспечыць сям'ю уласнай сельскагаспадарчай прадукцыяй. І не так важна, ў якім выглядзе гэта дача была атрымана, якія абмежаванні накладвала савецкая ўлада на выкарыстанне дачных участкаў, і нават памеры і асаблівасці розных форм – дачны рух пашыраўся з кожным годам.

Найбольш масавым было калектыўнае садаводства, бо агародніцтва з пасляваеннай адбудовай гарадоў паступова знікала, хоць і працягвала існаваць у пастановах і законах. Ствараліся і дачна-будаўнічыя кааператывы, цесна звязаныя з прадпрыемствамі і арганізацыямі [2, с. 254]. Савецкая ўлада спрабавала выкарыстоўваць інтарэс насельніцтва да дачы для зняцця сацыяльнага напружання ў гарадах у час іх імклівай разбудовы, такім чынам ліквідуючы недахоп месцаў масавага адпачынку. Праз дачны рух пашыралася выкарыстанне не зусім зручных для калгасаў і саўгасаў зямель для вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Звязана гэта і з неэфектыўнасцю сацыялістычнага землекарыстання і з жаданнем саміх гараджан мець стабільнасць у забеспячэннем сваіх сем'яў прадуктамі харчавання.

Цікавым і даволі арыгінальным матывам карысталася савецкая ўлада, калі тлумачыла ў сваіх пастановах неабходнасць дачнага землеўладання – прывучаць маладое пакаленне да працы [4]. Пры гэтым дачны ўчастак часта выдзялялі ў лясістай мясцовасці, дзе дачнікі ўсёй сям'ёй карчавалі дрэвы і кусты. Зварот да першабытных форм землекарыстання, амаль да падсечнага земляробства сведчыў пра нерацыянальнасць савецкага ладу жыцця. Былі розныя спробы пераадолець гэта, аднак савецкая ўлада, сутыкнуўшыся з масавым дачным попытам і не маючы іншых магчымасцяў задаволіць узрастаючыя патрэбы гараджан, ішло па шляху найменшага супраціўлення - даць тое, што людзі патрабуюць.

Практыка дачнага жыцця 70–80-х гадоў сведчыла, што савецкія грамадзяне на дачы шукалі далёка не сацыялістычны спосаб адпачынку, а выразна стараліся задаволіць свае ўласніцкія жаданні і адмежавацца ад сацыялістычнай рэчаіснасці плотам дачы. Настолькі частымі сталі парушэнні дачнага заканадаўства, наколькі выразна характэрнымі яны былі менавіта для савецкай наменклатуры, пераважна партыйцаў і кіруючых работнікаў,што сведчыла аб заняпадзе савецкага ладу. Савецкая ўлада ішла на чарговыя ўступкі – дазваляла будаваць домікі, давала пад дачы сельскагаспадарчыя землі, а наменклатура будавала недазволеныя катэджы у калектыўных садах,  дабудоўвала забароненыя лазні і гаражы, вылазіла за межы ўчасткаў, пазастаўляла у шматгадовай чарзе на дачныя ўчасткі рабочых прадпрыемстваў [3, л. 80]. Дачы падрывалі савецкі лад жыцця.

Такім чынам, дача ў БССР разглядалася як неабходны сродак выжывання пераважна гарадскога насельніцтва, месца адпачынку савецкіх грамадзян, чарговая форма апрацоўкі зямлі і ўвядзення у сельскагаспадарчы абарот няўдобіц, спосаб зняць сацыяльнае напружанне у час імклівай урбанізацыі, прэстыж валодання загарадным участкам, месца працоўнага выхавання маладога пакалення, спосаб для насельніцтва адпачыць ад сацыялізму і такім чынам задаволіць свае уласніцкія жаданні,спосаб уцячы з неспрыяльных экалагічных умоваў вялікага гораду.

Дачны рух хоць і выглядае савецкай спадчынай, аднакнясе ў сабе адбітак капіталізму дасавецкага перыяду. і цалкам зразумела, калі з распадам СССР многія савецкія з'явы паступова знікалі, дачныя запыты насельніцтва застаюцца даволі высокімі. Хто не паспеў ці не хацеў атрымаць савецкую дачу, можа сёння капіталістычным спосабам здабыць сабе надзел з домікам. Тэрмін "дача" усё часцей ужываюць для вызначэння любой дадатковай загараднай маёмасці.  Гэта кажа пра трываласць такога інстытута як дача і магчымасць яго выкарыстання ў грамадскіх і эканамічных працэсах і надалей.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Дурилин, П. Н. Московские пригороды и дачные поселки в связи с развитием городской жизни / П. Н. Дурилин. – Москва, 1918. – 41 с.
2. Лубінскі, І. І. Прававы аспект фарміравання дачных таварыстваў у БССР у 1944–1991 гг. / І. І. Лубінскі // Научные труды Республиканского института высшей школы : исторические, психолого-педагогическиенауки / редкол.: В. А. Гайсёнок [и др.]. – Минск : РИВШ, 2018. – Вып. 18, ч. 1. – С. 252–258.
3. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд 4п. – Оп. 144. – Д. 74. – Л. 77-80.
4. О личных подсобных хозяйствах колхозников, рабочих, служащих и других граждан и коллективном садоводстве и огородничестве [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров СССР, 14 сентября 1977 г., N 843 // Библиотека нормативно-правовых актов Союза Советских Социалистических Республик. – Режим доступа: http://libussr.ru/doc_ussr/usr_9425.htm – Дата доступа: 09.09.2018.
5. Правовое положение садоводческих, огороднических и дачных некоммерческих объединений граждан : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата юридических наук : 12.00.03 / Бутовецкий Алексей Игоревич. – Москва, 2010. – 31 с.
6. Советин, Н. И. Индивидуальное рабочее огородничество и задачи, стоящие перед ним в 1936 году / Н. И. Советин. – 1936. – 20 с.
7. Социокультурные факторы формирования дачного пространства вокруг Санкт-Петербурга : 1870–1914 : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата юридических наук : 07.00.02 / Малинова Ольга Юрьевна / С.-Петерб. ин-т истории РАН. – Санкт-Петербург, 2005. – 20 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова